*Доўнар, Т.І  Народаўладдзе ў Беларусі ў старажытны перыяд / Т. І. Доўнар // Традиции и инновации в праве : материалы междунар. науч.-практ. конф., посвящ. 20-летию юрид.фак. и 50-летию Полоц. Гос.ун-та, Новополоцк, 6–7 окт. 2017 г. : в 3 т. / Полоц. Гос. ун-т, Регион. Учеб-науч.-практ. Юрид. Центр ; редкол. И.В. Вегера (отв. ред.)  [и др.]. –Новополоцк : Полоцкий государственный университет, 2017. – Т. 1. – С.110–115.*

**УДК 34 (476) (091)**

# НАРОДАЎЛАДДЗЕ Ў БЕЛАРУСІ Ў СТАРАЖЫТНЫ ПЕРЫЯД

*Т.І.Доўнар, прафесар кафедры*
*тэорыі і гісторыі дзяржавы і права,*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*доктар юрыдычных навук, прафесар*

Самыя старажытныя звесткі, якія дайшлі да нашага часу аб Усходняй Еўропе, сведчаць аб высокай ступені арганізацыі жыцця насельніцтва на самай ранняй стадыі існавання дзяржаўнасці. Славяне былі “мнагалюдным народам”, які займаў “непамерную прастору, бо без гэтага, як адзначаў М.І. Ермаловіч, нельга растлумачыць, чаму яны змаглі рассяліцца на вялікай тэрыторыі, ассіміляваўшы шматлікія плямёны і народы [1]. Славацкі гісторык П. Шафарык даказваў магутны рух славян, якія мелі высокую грамадскую упарадкаванасць, у V–VII ст. на захад і поўдзень і іх аселасць на беларускіх землях [2, с.84, 162]. Таксама візантыйскія гісторыкі яшчэ ў VI ст. адзначалі, што ў грамадскай арганізацыі усходніх славян ёсць некалькі груп, якія кіруюцца племянной знаццю на чале з адным чалавекам і што жывуць яны ў народапраўстве  і іх нельга схіліць да рабства або падпарадкавання [3, с.23-26.]. Увогуле ідэі народаўладдзя і народнага суверэнітэту, як палітыка-прававыя азначэнні здольнасці народа ажыццяўляць вяршэнства  улады на ўласнай тэрыторыі, маюць глыбокія гістарычныя карані.

У навуковай літаратуры часта пазначаецца, што дзяржавы Усходняй Еўропы не набылі завершанага манархічнага  ўладкавання  і на працягу ўсяго існавання  мелі схільнасць да народаўладдзя. На падставе абшчыннага спосабу гаспадарання ў іх склалася даволі ўстоўлівая сістэма публічнай улады, асноўнымі элементамі якой выступалі інстытуты непасрэднай дэмакратыі і абшчынна-вечавога самакіравання ў гарадах і сельскай мясцовасці. Фактычна існаваў пэўны дуалізм палітычнага ўладкавання, які сумяшчаў цеснае ўзаемадзеянне  і цесную ўзаемасувязь элементаў: манархічнага (у асобе запрошанага або спадчыннага князя і яго рады) і дэмакратычнага (у асобе народных вечавых сходаў). Пры гэтым патрэбна адзначыць умоўнасць выкарыстання тэрмінаў «манархічны», «арыстакратычны», «дэмакратычны» да пазначанага перыяду, таксама як і мець на ўвазе, што ў  сучасным палітычным лексіконе тэрмін “народны суверэнітэт” выціснуты паняццем “дэмакратыя”.

Дзяржаўная ўлада ва ўсходнеславянскіх княствах аб’ядноўвала ў сабе публічна-прававы і прыватнаправавы аспекты. Як правіла, сістэма органаў дзяржаўнай улады уяўляла сабой сукупнасць трох асноўных інстытутаў: князя, княжацкай рады і веча, якія ў сваёй функцыянальнай дзейнасці ў значнай ступені залежалі адзін ад другога. Пры гэтым галоўным абавязкам князя на ранніх этапах развіцця дзяржаўнасці з’яўлялася ў асноўным арганізацыя абароны дзяржавы. Як адзначаў А. Е. Праснякоў, князь – гэта «вождь и организатор народного ополчения, глава общего управления землей, защитник от внешней опасности и гарант внутреннего мира» [4, с.197]. Увогуле ж улада ў старажытных дзяржавах аб’ектыўна не магла быць адзінай, бо поруч з дзяржаўнай існавала ўлада “грамады”. Традыцыйна князь ажыццяўляў свае паўнамоцтвы разам з вечам. Аднак рэальнае праяўленне гэтых інстытутаў ў розных княствах некалькі (а часам і істотна) адрозніваліся. Напрыклад, агульнавядома аб асаблівым становішчы веча ў Ноўгарадзе, Пскове і Полацку, г.зн. на тых тэрыторыях, якія былі заселены пераважна крывічамі.

Многія навукоўцы адзначалі, што веча як найбольш старажытны орган дзяржаўнай улады, ўяўляла сабой агульны сход свабодных людзей, які існаваў амаль ва ўсіх славянскіх дзяржавах у ноўгарадцаў, смалян, кіяўлян палачан і г.д. [5, с.64]. Пры гэтым большасць навукоўцаў прытрымлівалася думкі, што веча паўстала адначасова з дзяржавай. Так, расійскі гісторык права У.Сяргеевіч пісаў: «вече ... существует с незапамятных времен и было всегда» [6, с.33]. Аднак некаторыя навукоўцы (напрыклад, Б.Д. Грэкаў), не адмаўляючы, што веча адносіцца да самага старажытнага перыяду ўсхонееўрапейскай гісторыі, пазначалі “маўчанне” веча з X па XII стагодддзі. У Кіеўскім княстве доўгі час яно ўвогуле не функцыянавала. Росквіт вечавой дзейнасці прыходзіцца на перыяд феадальнай раздробленасці

Адносна сутнасці і ролі веча ў навуковай літаратуры таксама выказваліся розныя погляды. Так, В.О.Ключэўскі лічыў, што адзінаўладдзе ў Старажытнай Русі да сярэдзіны середины XI ст. увогуле было палітычнай выпадковасцю і пасля смерці Яраслава Мудрага больш не паўтаралася [7, с.169-170.]. Навуковец сфармуляваў ідэю “калектыўнага сюзерэнітэту”, зыходзячы, як і С.М.Салаўёў, не з сацыяльна-эканамічных, а з родавых перадумоў. Увогуле многія расійскія навукоўцы адзначалі, што веча – гэта орган старажытнага “русского народоправства", аднак яны шмат у чым разыходзіліся ў думках адносна сутнасці самога тэрміна “веча”, а таксама по многіх іншых пытаннях (складу веча, тэрыторыі яго дзейнасці, кола разглядаемых ім пытанняў і г.д.). Пры гэтым навукоўцы правільна пазначалі, што ў розных землях веча мела розныя назвы і словамі «веча», «снем», «сойм», «капа», «купа» даўней пазначаўся ўсялякі грамадскі сход або нарада, а склікаць веча – азначала прадставіць справу на абмеркаванне ўсяго народа.

Як правіла, веча збіралася ў вызначаных месцах: у больш старажытны перыяд часцей за ўсё на месцах паганскіх капавішчаў, пазней – каля царквы, на гандлёвых пляцах і інш. Веча склікалася па ініцыятыве самога князя, ці княжацкай рады, ці групы вольных людзей. Летапісы сведчаць, што часцей за ўсё вечавы сход склікаўся князем. Аднак веча лічылася правамоцным і тады,

калі па нейкіх прычынах збіралася стыхійна і не ў загадзя вызначаным (традыцыйным) месцы, бо ўдзел у палітычным жыцці дзяржавы ўсіх сабодных (паўнапраўных) людзей з'яўляўся неабходнай умовай для належнага функцыянавання органаў улады ў старажытных княствах. Пры невялікім службовым апараце княжацкія органы ўлады змушаны былі пастаянна шукаць падтрымкі ў насельніцтва, а таму ўсе больш-менш важныя пытанні дзяржаўнай палітыкі маглі быць праведзены ў жыццё толькі са згоды большасці паўнапраўных грамадзян. Часам сам князь шукаў падтрымку ў народа. Так, В.Т.Пашута пісаў: «Великоняжеская власть, выступая против засилья растущей сеньориальной боярской знати, опиралось на поддержку торгово-ремесленных верхов городов («мужи градские») и на служилый феодалитет («служилое боярство») [8, с.304].

Несумненна, склад, кампетэнцыя і роля веча ў дзяржаўным жыцці адрознівалася ў княствах Усходняй Русі ў залежнасці ад многіх прычын. Пры гэтым у шэрагу княстваў дзейнасць веча была вельмі актыўнай доўгі перыяд часу, у асобных княствах на даволі раннім гістарычным этапе веча ўвогуле было ліквідавана, у некаторых – пастунова страчвала свае функцыі, у іншых – склікалася толькі ў выключных выпадках. Прыкладам апошняга можа служыць вызваленне кіяўлянамі з «поруба» полацкага князя Ўсяслава Брачыслававіча (Чарадзея) у 1066 г. пры нападзе полаўцаў і няздольнасці кіяўскай улады арганізаваць абарону горада.

Як раннефеадальныя манархіі, беларускія княствы будаваліся па прынцыпу сэзерэнітэту-васалітэту. Аднак многія з іх не набылі завершанага манархічнага ўладкавання і на працягу ўсяго свайго існавання мелі цягу да народаўладдзя. На падставе звычайнага права і абшчыннага спосабу гаспадарання ў гэтых дзяржавах склалася даволі ўстойлівая сістэма публічнай улады, асноўнымі элементамі якой выступалі інстытуты непасрэднай дэмакратыі і абшчынна-вечавога самакіравання ў гарадах і сельскай мясцовасці. Існаваў пэўны дуалізм палітычнага ўладкавання, які спалучаў цеснае ўзаемадзеянне і ўзаемасувязь манархічнага (у асобе запрошанага або спадчыннага князя) і дэмакратычнага (у асобе народных вечавых сходаў) элементаў. Сістэма органаў публічнай улады ў беларускіх княствах ўяўляла сабой сукупнасць трох асноўных дзяржаўна-палітычных інстытутаў: князь, рада (савет пры князі), веча (сойм). Старажытнае веча (сойм) як орган дзяржаўнай улады ў гэтых княствах, як правіла, з'яўлялася агульным зборам дарослых вольных мужчын. Як сведчаць летапісы, яно існавала ў Полацку, Віцебску, Друцку, Тураве і іншых месцах. Хоць часцей веча склікалася па ініцыятыве князя, аднак часам яно збіралася самім народам і без князя самастойна вырашала значныя дзяржаўныя пытанні, асабліва калі гэта тычылася адносін з суседнімі "рускімі" землямі. Так, калі ў 1186 г. мяжу Полаччыны перайшлі смаленскія і ноўгарадскія войскі, палачане, абмеркаваўшы сітуацыю на веча, выбралі сваіх прадстаўнікоў, якія правялі перамовы і мірна ўрэгулявалі спрэчныя пытанні. Усе рашэнні на веча прымаліся, як правіла, большасцю галасоў.

Кола пытанняў на вечы не было строга азначана. Часцей вырашаліся найбольш важныя дзяржаўныя справы: абранне і зняцце з пасады (выгнанне)

князя, прызначэнне на пасады вышэйшых службовых асоб і пазбаўленне іх гэтых пасад, пытанні вайны і міру, міжнародныя адносіны, арганізацыя апалчэння і абароны, падаткі, судовыя справы. Увогуле патрэбна падкрэсліць, што суд з самага старажытнага часу традыцыйна адбываўся публічна, з удзелам народа. Навукоўцы адзначаюць, што судовая ўлада пераходзіць да дзяржаўных органаў (князя і веча) разам з устанаўленнем і фармалізацыяй публічнай улады, хоць частка яе даволі доўгі перыяд часу застаецца ў кампетэнцыі сходаў свабодных людзей – веча і абшчыны. Нават у перыяд Рускай Праўды абшчына валодала значнай судовай уладай і яе прадстаўнікі («добрыя людзі») вырашалі ўзнікшыя ў абшчынным асяроддзі спрэчкі. Так, З.М. Чарнілоўскі пісаў: «община оказалась настолько универсальным инструментом улаживания коллективных дел и конфликтов, что ее…. удерживает и феодальное право» [9, с.18]. Шэраг навукоўцаў лічыць, што ў Праўдзе Яраслава даецца апісанне абшчыннага парадку суда, які адбываўся «мірам», грамадствам, без удзелу князя і яго пасадніка. Судовыя справы вырашаліся зводам, сведкамі або паручнікамі [гл. падрабязней: 10]. Нават у княжацкім судзе значную ролю адыгрывалі свабодныя людзі, перш за ўсё самі бакі і іх прадстаўнікі, што сведчыць аб пэўным элеменце яго “народнасці”, хоць вызначыць суадносіны “княжацкага” і “народнага” суда, як адзначаюць навукоўцы, не ўяўляецца магчымым [11, с.31-32]. На веча маглі абмяркоўвацца і іншыя, значныя і менш значныя пытанні. Некаторыя навукоўцы адзначаюць, што ў канцы XII-XIII стст. развіццё старажытных дзяржаў характэрызуецца далейшай дэмакратызацыяй іх сацыяльна-палітычных сістэм . Адначасова ў гэты перыяд адбываецца павелічэнне значэння і ўплыву мясцовых княстваў і зямель на чале з гарадамі Полацк, Ноўгарад, Смаленск, Чарнігаў, Уладзімір і інш. на фоне распада суперсаюза княстваў, якім з’яўлялася Кіеўская Русь.

Аб значэнні веча ў дзяржаўным жыцці сведчыць той факт, што толькі зацверджаны вечам князь лічыўся легітымным. У выпадку, калі веча не згаджалася выбраць чарговага князя або не падтрымлівала яго, апошні павінен быў пакінуць горад. Напрыклад, у 1127 г. быў выгнаны вечам полацкі князь Давыд. Таксама не рызыкнуў вярнуцца ў Полацк князь Рагвалод Барысавіч пасля таго, як пацярпеў паражэнне ў сутыкненні з войскамі менскага князя Валадара Глебавіча у 1116 г., бо баяўся адказнасці перад вечам за гібель многіх палачан. Полацкае веча і пазней выганяла непажаданых князёў (1128, 1132, 1151, 1159 гг.) [12, с.268-273]. Увогуле палачане, як пішуць летапісы, «в той час волно собе пановали и жадной зверхности над собою не мели…., держали на той час землю Рускую сами мещане полоцкие… взявши кшталт справованя речи посполитой от оных славных справ грецких афинеов… » [13, с.20]. Тамсама пазначаецца, што ў другой палове XIII ст. «полочане, гды ся в том Глебе остатный потомок князей полоцких з Литвы замкнул (бо без потомства умер), почали собе волно жити, а пана над собою не мели» [13, с.21]. Гэта значыць, што палачане самі без князя ў той час кіравалі ўласнай дзяржавай. Увогуле Полацкая дзяржава, як адзначаюць навукоўцы, знаходзілася на шляху фарміравання сярэдневечнай вечавой рэспублікі. Княжацкая ўлада не страціла сваёй моцы, як гэта атрымалася ў Ноўгарадскай рэспубліцы, а веча не перастала

існаваць, як у Паўночна-усходняй Русі. Полацкі князь лічыўся галавой усёй полацкай зямлі нават тады, калі мясцовыя князі сталі гаспадарамі асобных зямель – Мінскай, Друцкай, Віцебскай і іншых, у якіх таксама склікалася веча.

Патрэбна адзначыць, што савецкая гістарычная школа ў цэлым падтрымлівала вывад аб існаванні ў Полацку моцнага веча. Аднак, калі Б.Д.Грэкаў, У.І.Пічэта, М.М.Ціханаў бачылі вечавы лад Полацка як наступства няўхільнага росту палітычнага ўплыву баярства і гандлёва-рамесных вярхоў у XII –першай палове XIII ст. “подобно новгородским порядкам”, то В.Т.Пашута, Л.В.Аляксеяў, Б.А.Рыбаков, І.Я.Фраянаў і іншыя адзначалі, што баярства не падзяляла сваёй рэальнай улады ні з кім іншым. У той жа час усе даследчыкі адзначалі і слабасць баярскай улады [14, с.129]. Аб моцы Полацкага веча сведчыць той факт, што яно працягвала дзейнічаць і ў складзе Вялікага Княства Літоўскага амаль да канца XV ст.,

Разам з тым навукоўцы адзначалі, што амаль з самага пачатку на вечавых сходах выразна праяўляліся два элементы – “добрых” і “малых” людзей, якія ў асноўным адрозніваліся сваім эканамічным становішчам. Так, М.В.Доўнар-Запольскі пісаў, што ў гэтым адрозненні, чыста бытавым, мы бачым зараджэнне сацыяльных падзяленняў і палітычнай няроўнасці будучых саслоўяў [15, с.52]. Менавіта таму з узмацненнем расслаення грамадства і павелічэннем дзяржаўнага апарату змяншаецца значэнне простых людзей і ўзрастае роля кіруючых феадальных вярхоў, таму веча становіцца менш патрэбным і яго перастаюць склікаць. Пры гэтым пэўны час засталася ў моцы старажытная народная ідэя разумення ўлады манарха як службовай асобы, якая павінна выказваць і ахоўваць інтарэсы ўсяго народа, хоць з цягам часу пад “народам” пачалі разумець не ўсіх людзей у дзяржаве, а толькі асоб, якія выконвалі воінскую павіннасць і ўваходзілі ў склад прывілеяванага саслоўя. У многіх помніках права Вялікага Княства Літоўскага XV- XVI стст. мы знаходзім нормы аб правах усіх людзей і выбранні князёў ўсім народам. Напрыклад, граматай (прывілеям) 1447 года вялікі князь абавязваўся захоўваць «ўсе правы, вольнасці і граматы», выдадзеныя не толькі свецкім і духоўным феадалам, але «гарадам, мяшчанам, жыхарам і наогул асобам усіх саслоўяў і стану»; граматай 1511 г. рэгламентавалася, што полацкі ваявода выбіраецца самімі полачанамі, а «который нелюб им – ино ему чист, иного избрати с полочан по испросу» [16, с. 89, 52] і г.д. Аднак зразумела, што ў гэты перыяд нормы аб захаванні правоў і вольнасцей усяго народа былі ўжо пэўнай данінай “старыне” і мелі яны ў большасці дэкларатыўны і прапагандысцкі характар.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1.Ермаловіч М. Славянскія дарогі Беларусі / М. Ермаловіч // ”Голас радзімы”, 1982, № 6. – 11 лютага 1982 года.

2. Шафарик П.И. Славянские древности / П.И. Шафарик. – М.: В Университетской типографии 1848. – Т.2. – Кн.1. – 462 с.

3. Белоруссия в эпоху феодализма: в 3 т. / Акад. наук БССР, Ин-т истории, Арх. упр. МВД БССР; редкол.: А.И. Азаров [и др. ]. – Минск: АН БССР, 1959-1961. – Т. 1. – Мінск, 1959. – 516 с.

4. Пресняков А.Е. Лекции по русской истории / А.Е Пресняков. – Т.1.Киевская Русь. – М.: Государственное социально-экономическое изд-во, 1938. – 280 с.
5. Юхо Я.А. Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі / Я.А. Юхо. – Мінск: “Універсітэцкае”. – 270 с.
6. Сергеевич В.И. Русские юридические древности / В.И. Сергеевич. – Т. 2. Вып. первый : Вече и князь. – СПб.: типогр.Н.А.Лебедева, 1893. – 336 с.
7. Ключевский В.О. Соч. В 9 т. Т.1. / В.О. Ключевский Т1. Часть 1. Курс русской истории. – М.: Мысль, 1987. – 432 с.
8. Пашуто В.Т. Очерки по истории Галицко-Волынской Руси / В.Т. Пашуто. – М.: АН СССР. Ин-т истории. [М.] изд. и 2-я тип. Изд-ва АН СССР, 1950. – 386 с.
9. Черниловский З.М. Русская Правда в свете других славянских судебников / З.М. Черниловский // Древняя Русь: проблемы права и правовой идеологии: Сборник научных трудов. – М. : изд-во РИО ВЮЗИ., 1984. –С. 3- 28.
10. Чебаненко, С.Б. Княжеский и народный суд в Древней Руси / С.Б. Чебаненко: дис… канд. исторических наук [07.00.02] – СПб, 2007. – 308 с.
11. Рубаник, В.Е. Суд и следствие в нашем прошлом: исторический обзор / В.Е. Рубаник // История государства и права, 2012, № 20. – С.28-32.
12. Алексеев Л.В.Полоцкая земля: (очерки истории Северной Белоруссии) в IX-XIII в. –Москва: Наука, 1966. – 295 с.
13. Хроника Литовская и Жемойтская // Полное собрание русских летописей. – М., 1975. – Т. 32. – С. 16-127.
14. Стешенко, Л.А., Шамба, Т.М. История государства и права России: Академический курс. В 2 т / Л.А. Стешенко, Т.М. Шамба.. – Т.1.V – начало XX в. – М.: Изд-во НОРМА, 2003. – 734 с.
15. Доўнар–Запольскі, М.В. Гісторыя Беларусі / М.В Доўнар–Запольскі / Беларус. Энцыкл., Нац.арх. Рэсп. Беларусь; пер. з рус. Т.М.Бутэвіч і інш. Мінск: Бел Эн, 1994. – 510 с.
16. Дагаворы і граматы як крыніцы беларускага феадальнага права: Дапаможнік / Я.Юхо, А.Абрамовіч, Т.Доўнар, У Сатолін. – Мінск: БДУ, 2000. –127 с.